№№185–186
(2913–2914)

5—8 снежня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ЛІСТ З РЭДАКЦЫІ

Не спазніцеся!

Шаноўныя чытачы!

Зусім мала часу адпусціла "Белпошта" на падпіску на першую палову 2009 года — да 24 снежня.

Менавіта толькі да гэтай даты будзе прымацца падпіска і ў рэдакцыйным офісе.

Таму вялікая просьба: не спазніцеся! Няма магчымасці падпісацца на шэсць месяцаў, падпішыцеся на квартал.

ВЕРСИИ

В Могилев едет новый «губернатор»...

Когда этот номер "Народной воли" сдавался в печать, официальной информации о том, кто займет пост "губернатора" Могилевщины, не было. Но циркулировали слухи, что это выпадет на долю вице-премьера Владимира Семашко.

Если верить народной молве, пост председателя Могилевского облисполкома мог занять и другой вице-премьер — Иван Бамбиза.

Среди возможных претендентов на пост "губернатора" Могилевщины назывался и экспредседатель Палаты представителей Владимир Коноплев, однако, как сообщают наши источники во властных структурах, его кандидатура серьезно не рассматривалась.

Среди чиновников Владимира Семашко называют фаворитом А.Лукашенко. Впрочем, Лукашенко и сам не раз публично говорил, что ему нравится, как Владимир Ильич относится к работе, и пока его не в чем упрекнуть... Правда, в глазах общественности имидж Семашко пошатнулся после того, как многие газеты опубликовали снимок с церемонии возложения цветов к Вечному огню на площади Победы во время визита в Беларусь Муаммара Каддафи. Владимир Семашко на том фото был одет в одежду явно не своего размера и выглядел совсем не как первый вице-премьер...

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

Марш дазволілі...

Як паведаміў "Народнай волі" старшыня РГА "Перспектыва" **Анатоль Шумчанка**, учора Мінгарвыканкам дазволіў правядзенне 15 снежня "Маршу прадпрымальнікаў".

"З 1 студзеня прадпрымальнікам працаваць стане практычна немагчыма, — кажа Анатоль Шумчанка. — *Акрамя таго, улада прадстаўляе гэты клас насельніцтва як спекулянтаў, якія быццам бы стараюцца падарваць эканоміку краіны. Гэта не так. Калі ў нашых дзяржаўных чыноўнікаў хопіць розуму, то яны сядуць за стол перамоў з прадпрымальнікамі".*

Па словах Анатоля Шумчанкі, людзі збяруцца ля Акадэміі навук, а сама акцыя пройдзе на плошчы Бангалор.

"Марш пройдзе выключна пад лозунгамі прадпрымальніцкіх праблем і не будзе мець палітычнага адцення, — дадае лідэр "Перспектывы". — *У сувязі з гэтым мы пераканаўча просім розныя палітычныя партыі і маладзёжныя рухі паставіцца да гэтага з разуменнем. Дарэчы, калі ўлады да 15 снежня вернуць "іпэшнікам" папярэднія ўмовы працы, то, натуральна, мерапрыемства праводзіць не будзем. Але калі і марш не дасць эфекту, то мы плануем ізноў падаць заяўку на акцыю пратэсту 12 студзеня".*

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ПОЛИТКУХНЯ

У Беларуси есть время до весны

3 декабря председатель Еврокомиссии Жозе-Мануэль Баррозу и комиссар ЕС по внешним связям и политике добрососедства Бенита Ферреро-Вальднер официально представили инициативу Восточного партнерства (ВП) — нового формата сотрудничества Евросоюза с Украиной, Грузией, Азербайджаном, Арменией, Молдовой и нашей страной.

Беларусь в схеме будущего партнерства пока стоит в скобках. Чтобы стать его полноправной участницей, Беларусь должна соответствовать европейским стандартам. Об этом заявила комиссар ЕС по внешней политике и политике добрососедства Бенита Ферреро-Вальднер 3 декабря на пресс-конференции в Брюсселе.

Как сообщила Ферреро-Вальднер, 2 декабря послы шести стран, в том числе и Беларуси, встретились в Брюсселе с представителями Еврокомиссии. По ее словам, белорусские власти понимают, как много должно быть сделано, чтобы стать полноценным участником Европейской политики добрососедства, а также "новой усиленной политики" в ее рамках — политики Восточного партнерства.

Как уже сообщала "Народная воля", Восточное партнерство включает в себя ряд заманчивых предложений для шести стран бывшего СССР: либерализацию визового режима до полного упразднения виз в долгосрочной перспективе; создание общей экономической зоны и зоны свободной беспошлинной торговли между ЕС и странами — участницами ВП, а также присоединение шестерки стран к Договору об энергетической безопасности. Для этого страны — участницы Восточного партнерства должны перенять все законодательные акты ЕС и признавать вердикты Европейского суда.

Ожидается, что 11 декабря политика Восточного партнерства будет одобрена на Европейском саммите глав стран объединенной Европы. Решение о полноценном участии Беларуси в ВП будет приниматься весной 2009 года в зависимости от демократического прогресса страны.

Игорь ЗАЛЕССКИЙ.

ТЕМА ДНЯ

Насколько глубоким будет финансовый кризис в Беларуси?

Об этом размышляет экс-министр внешнеэкономических связей, доктор экономических наук, руководитель ассоциации "Европейское измерение", бывший политзаключенный ***Михаил МАРИНИЧ***

— Нынешний кризис, как известно, в наибольшей степени поразил страны, имеющие большой дефицит текущего баланса и существенно зависимые от внешнего финансирования. А из них особенно те страны, где западноевропейские банки активно развивали ипотечное кредитование. В Восточной Европе это, прежде всего, Латвия, Болгария, Румыния.

Несмотря на то, что финансовая система Беларуси относительно слабо включена в мировую финансовую систему и белорусские банки менее зависимы от внешнего кредитования, финансовый кризис может обернуться для Беларуси самыми тяжелыми последствиями по нескольким причинам.

Первое. Беларусь еще до кризиса имела очень большое отрицательное сальдо внешней торговли. Сегодня оно уже достигло 5 млрд долларов. Что будет впереди, можно только предполагать, очевидно одно — условия торговли ухудшатся, поскольку наши основные торговые партнеры будут иметь гораздо меньше возможностей платить за белорусские товары, к тому же в большинстве своем не очень качественные. Сложно сказать, какова будет "кризисная" судьба большинства белорусских экспортеров, если даже такой гигант, как "Беларуськалий", уже вынужден пересматривать свои экспортные планы.

Кризис, который начинался как финансовый, стал экономическим, и пострадает от него, особенно в Беларуси, в основном реальный сектор экономики.

Второе. С 2009 года, как известно, энергоресурсы для Беларуси станут дороже. Соответственно вырастут цены и на продукцию.

Третье. Доступ к финансам из-за их высокой стоимости был затруднен для белорусских субъектов хозяйствования и до кризиса. Сегодня цена кредитных ресурсов еще более возросла, и в ближайшее время ее уровень не понизится.

Кредит на 2 млрд долларов, которые пообещала нам Россия, обременен политическими и экономическими условиями. Пока сложно сказать, и широкая общественность вряд ли вообще узнает, на какие уступки придется пойти Беларуси, чтобы получить вторую траншу.

Кредит МВФ (о котором мечтает Беларусь), возможно, будет предоставлен, но только на условиях выполнения ряда требований по реформированию белорусской экономики. И этапы кредитования будут привязаны траншами (а не всем кредитом в 2 млрд) к выполнению Беларусью этих условий.

Четвертое. Сегодня страна нуждается в финансах. Только в ноябре население скупило более 300 млн долларов США, хотя еще недавно оно выступало поставщиком валютных средств. Нацбанк уже вынужден был истратить значительную часть из имевшихся валютных резервов (этот резерв на пике достигал 4 млрд долларов США) для поддержания курса рубля, а ведь худшие времена еще впереди.

Понятно, что нужна девальвация. Вопрос в том, хватит ли у Нацбанка валюты для того, чтобы снижение курса рубля проходило относительно плавно, или нам суждено пережить очередной дефолт.

Пятое. Прямых инвестиций в белорусскую экономику по-крупному как не было, так и не будет. В условиях кризиса инвесторы вообще предпочитают не рисковать, а если и вкладывают некоторые средства, то в основном в покупку сильно обесценившихся активов. К тому же рейтинг инвестиционных возможностей нашей страны, несмотря на бодрые заявления правительства, остается невысоким.

В целом надо сказать, что проблемы в экономике нашей страны начались задолго до того, как разразился мировой финансовый кризис, и порождены они прежде всего тем, что белорусская экономика была и остается командно-административной (советского типа). Поэтому для преодоления кризисных явлений Беларуси предстоит предпринять двойные усилия: направленные на минимизацию последствий мирового кризиса и на реформирование экономической системы. Очевидно, что первое невозможно без второго.

— Как будет развиваться кризис?

— Если банковская система Беларуси относительно меньше, по сравнению с финансовыми системами других стран, подвержена влиянию кризиса, то с реальным сектором ситуация прямо противоположная. Для преодоления кризиса нужна серьезная перестройка стратегии развития предприятий, наши же предприятия неповоротливы, они не свободны в принятии стратегических (а часто и оперативных) управленческих решений, не говоря уже о выборе форм собственности.

Глубокая, а не формальная либерализация экономики требует благоприятной политической среды, каковая напрочь отсутствует в Беларуси.

Поэтому я думаю, что следующий год будет очень трудным. Пик кризиса придется как раз на него. Нынешний дефицит торгового баланса на уровне 7 млрд долларов, скорее всего, еще далеко не предел. Для выхода же из кризиса Беларуси понадобится, по моему мнению, минимум четыре года.

Но в целом кризис может пойти стране на пользу — ведь под действием "обстоятельств непреодолимой силы" власти все равно будут вынуждены осуществить какие-то реформы.

— Что бы вы сегодня делали на месте руководителя предприятия?

— Как я уже говорил, сегодня руководитель предприятия — заложник плановой экономики. Несколько в лучшей ситуации оказались те предприятия, которые развивались за счет собственных средств и не имели больших долгов. Таких, думаю, не много.

Что бы я делал? Работал бы по нескольким основным направлениям. Прежде всего необходимо избавиться от балласта абсолютно ненужной и простаивающей собственности, которой у каждого крупного предприятия достаточно. Всю продукцию, залежавшуюся на складах, необходимо срочно распродать, пусть даже по сниженным ценам. Очень важно поощрять предпринимательскую инициативу внутри предприятия — мини-бизнес-планы для внутреннего потребления (кафе, предприятия обслуживания для работников и т.д.).

Издержки, связанные с содержанием так называемых социальных объектов, должны быть сведены к минимуму.

Понятно, что основной резерв — сокращение издержек производства за счет снижения энергоемкости продукции, перехода на энергоэффективное производство, оптимизации дистрибьюторской сети и т.д.

Большинству предприятий не избежать перевода работников на неполную рабочую неделю, снижения уровня оплаты труда, а где-то и увольнений. Эти меры вызовут меньшее недовольство, если люди увидят, что решительно сокращаются административные издержки.

Полезным было бы сформировать "антикризисную команду" молодых профессиональных управленцев. Только после всего этого можно было бы говорить о привлечении инвестиций.

К сожалению, белорусские реалии таковы, что, осуществив хотя бы половину этих очевидно разумных и необходимых мер, директор автоматически подвергает себя риску уголовного преследования. Тюрьмы сегодня переполнены управленцами, обвиненными в так называемых экономических преступлениях. Статью можно получить даже за реализацию по низким ценам не находящей сбыта продукции...

— Как вы относитесь к мерам по ограничению импорта?

— Ограничивая административными мерами импорт, государство совершает нелогичный и очень плохой по своим последствиям шаг. В очередной раз оно ищет врагов не там, где нужно. В условиях дефицита валюты понятно желание заставить как можно меньше ее тратить. Но искусственно остановить финансовые потоки — значит вредить производству. Если правительство добивается этого, то оно почти у цели.

В условиях кризиса предприятиям нужно дать свободу еще большую, чем раньше. Ограничивая импорт, государство бьет и по реальному сектору, и по населению. Большинству предприятий нужны импортное оборудование, комплектующие, сырье и т.д. Говорить о том, что в Беларуси будет натуральное хозяйство, сегодня уже как-то даже не смешно.

Экономическая теория гласит, что от мировой торговли страны выигрывают, и чем больше объем торговли, тем больше доход всех ее участников. Собственно, поэтому-то и получила развитие глобализация, нравится это кому-то или нет.

Люди должны понимать: нам надо готовиться к трудным временам. Девальвация означает неизбежнее сокращение сбережений. Выводы для себя каждый должен делать сам. Это трудно. Особенно после того, как государство многие годы приучало нас не думать о будущем, о своей семье, не зарабатывать, а просто работать ради шкварки и чарки. И сейчас президент по сути призывает к тому же — обзаводиться натуральным хозяйством. Нет, если уж разводить кур, то для того, чтобы вести предпринимательскую деятельность.

Думайте о себе, о своих детях и внуках, а также о своем предназначении. О том, что мы — люди, что у нас есть честь и достоинство, что каждый человек имеет право заниматься своим делом, право на свободу и достойную жизнь. Тогда и страна легче преодолеет кризис и, наконец, поднимется с колен.

ПАРАЛЛЕЛИ

В США бензин почти в два раза дешевле, чем в Беларуси

Цены на автомобильное топливо в Америке и у нас снизились почти одновременно. Но на кошельках граждан обеих стран это отразилось по-разному.

В конце ноября в Соединенных Штатах Америки в очередной раз упали цены на бензин. С августа бензин и дизтопливо в США подешевели почти в 2 раза, сегодня литр бензина (в среднем) там стоит чуть более 50 центов, дизтоплива — около 70 центов.

С 1 декабря наконец-то бензин стал дешевле и в нашей стране. Правда, впервые за все то время, как в мире подешевела нефть. И цена на топливо в Беларуси упала не на 50 процентов, как в США, и даже не на 20, как в России, а всего лишь на 10 процентов. Теперь А-76 стоит 1760 рублей за 1 литр, АИ-92 — 2220 рублей, АИ-95 — 2530 рублей, а дизтопливо — 2020 рублей. Выходит, что литр даже самого дешевого в Беларуси автомобильного топлива (А-76) дороже самого дорогого горючего (дизтоплива) в Америке. А популярный АИ-92 белорусские автолюбители покупают в два раза дороже, чем приобретают аналогичное топливо американские водители. Хотя зарплаты у американцев и белорусов несопоставимо разные.

В сентябре, если верить официальным данным, средняя зарплата в Беларуси составляла 445,9 доллара. В США среднестатистический американец зарабатывает в месяц 3,5 тысячи долларов.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Страна	Средняя зарплата (дол. США)	Цена за 1 литр (дол. США) бензина	дизтоплива
США	3500	0,5	0,7
Беларусь	445,9	0,8—1,12	0,9

С 1 декабря бюджетникам понизили зарплату

А коммунальные платежи могут возрасти

— 29 ноября правительство приняло постановление, согласно которому с 1 декабря понижается тарифная ставка I разряда, которая применяется для расчета оплаты труда в бюджетных организациях, — еще во вторник эту информацию сообщил нашей газете финансист одного НИИ города Минска. — *Ситуация получилась скандальная: в ноябре зарплату бюджетникам повысили, а в декабре понизят. Правительство даже опасается массовых выступлений людей, и, например, с сотрудниками нашего отдела была проведена беседа, чтобы мы как можно мягче объясняли работникам ситуацию с понижением зарплаты, успокаивали их тем, что все равно декабрьские зарплаты будут выше октябрьских. Получилось ведь как: с 1 ноября тарифная ставка I разряда с 73 тысяч рублей была повышена до 91 тысячи, и ноябрьская зарплата увеличилась у бюджетников в пределах 20 процентов. Сейчас тарифную ставку понизят до 77 тысяч, значит, зарплаты будут ниже ноябрьских на процентов 15, а октябрьских выше всего лишь на 4-5 процентов.*

В среду вечером стало известно, что понижение зарплаты бюджетникам — не слухи, а реальность. Агентство "Интерфакс" распространило информацию, что понижение зарплаты с 1 декабря будет производиться на основании постановления правительства №1818 от 29 ноября 2008 года.

Информация, которая шокировала белорусских бюджетников, не удивила экономистов.

— В бюджете нет денег, — говорит экономист **Леонид Злотников**. — Только за последние два-три месяца валютная выручка от внешней торговли понизилась на 25%, и ожидается ее дальнейшее понижение. Правительство очень быстро расходует имеющиеся резервы. Кроме того, не стоит забывать, что Беларусь попросила у Международного валютного фонда кредит в размере 2 миллиардов долларов. А МВФ выставил требование: хотите кредит — выполняйте, как и другие страны, ряд условий. Иначе кредит, который МФВ может дать, не поможет Беларуси пережить кризис. Одно из этих условий — отменить повышение тарифной ставки I разряда. Миссия Международного валютного фонда начнет второй раунд переговоров с белорусскими властями 15 декабря, вот официальный Минск к ним и готовится.

Не исключено, что скоро придется больше платить за услуги ЖКХ, потому что еще одно требование МВФ — довести оплату коммунальных услуг населением до 100 процентов. Возможно, государство не переложит все расходы на население, но может значительно повысить процент оплаты этих услуг. И третье условия МВФ — провести девальвацию рубля. Доллар будет расти, и, думаю, что стабилизируется белорусский рубль не раньше весны.

Военных и милиционеров лишили добавки к окладам

Судя по всему, недосчитаются в декабре денег и все, кто носит погоны. Военные пенсионеры уже получили декабрьскую пенсию, она на 350—400 тысяч ниже ноябрьской.

— Как нам объяснили, в ноябре были увеличены оклады по званию, — рассказал "Народной воле" подполковник в отставке Олег Шаповалов. — *И действующие военные, и отставники в среднем получили на 300 тысяч больше, чем в октябре. Например, я вышел на пенсию в звании подполковника, в ноябре мне повысили пенсию до 1 миллиона 20 тысяч. А в декабре это повышение было решено снять. И нам вернули прежние, октябрьские, зарплаты и пенсии. В декабре я уже получил пенсию в размере 750 тысяч.*

Та же ситуация и у пенсионеров МВД. Наш читатель, полковник в отставке, который пожелал остаться неназванным, рассказал, что обычно пенсии бывшим милиционерам повышали в начале года, в среднем на 150—200 тысяч. А тут неожиданно увеличили ее в ноябре.

— В прошлом месяце моя пенсия подскочила до полутора миллиона, — рассказал наш читатель. — *Знакомые сказали, что не только пенсионерам МВД, но и всей милиции увеличили оклады за звание. Но в декабре, ничего не объясняя, мне снова выплатили пенсию в размере октябрьской. Она составила 1 миллион 50 тысяч, т.е. на 450 тысяч стала меньше ноябрьской. Позвонил знакомым, говорят, что просто убрали прибавку за звание.*

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧ

Патрабуйце — і вам не адмовяць

У некаторых паштовых аддзяленнях чытачам "Народнай волі" адмаўляюць у падпісцы.

У рэдакцыю звярнуўся наш чытач з Мінска Барыс Янкоўскі.

"Як толькі даведаўся, што на "Народную волю" стала магчымым падпісацца на пошце, адразу ж пабег на паштовае аддзяленне №1, што на вуліцы Маскоўскай, — расказаў Барыс Браніслававіч. — *Запоўніў абаненцкую картку, тлумачу супрацоўніцы аддзялення, што хачу падпісацца на "Народную волю". І нечакана чую ў адказ: "На гэтую газету падпіску мы не афармляем, бо ў нас на гэта няма распараджэння".*

Мы, натуральна, патэлефанавалі начальніцы гэтага аддзялення, якая нас запэўніла, што адбылася прыкрая недарэчнасць. Маўляў, маладая супрацоўніца толькі ўладкавалася на працу і таму не ўсё яшчэ ведае. У такім выпадку цікава: а чаму начальства не праводзіць інструктаж? Ці гэта зусім не патрэбна? Перакладаць усе няшчасці на галаву *"маладой супрацоўніцы"* прасцей за ўсё.

А нашым чытачам параім: калі вы захацелі падпісацца на "Народную волю", але вам у гэтым адмаўляюць, то звяртайцеся непасрэдна да начальства паштовых аддзяленняў. І патрабуйце больш рашуча. У крайнім выпадку — тэлефануйце ў рэдакцыю. Дапаможам!

Аляксандр ФЁДАРАЎ.

Увага!

Падпісныя індэксы «Народнай волі» ў каталогах «Белпошты»:

63222 *— для індывідуальных падпісчыкаў,*
632222 *— для прадпрыемстваў і арганізацый*

Народная Воля http://www.nv-online.info
5 СНЕЖНЯ 2008 г.

ВІНШУЕМ!

Сустрэчы з ім — як сустрэчы з пагодным, светлым днём

7 снежня акадэміку Радзіму Гарэцкаму — 80!

Вы ведаеце, што гэта такое — меланж? Што азначае гэтае, такое характэрнае па сваім гучанні французскае слова? У побытавым, у тым сэнсе, як яно ўжываецца ў красвордах, мабыць ведаеце. Ну, скажам, калі размова заходзіць пра пэўнага кшталту пражу. Але не больш за тое.

Між тым яно мае і іншыя, не менш важныя значэнні. Стаць на хвіліну семасіёлагамі дае нам магчымасць новая публікацыя акадэміка Радзіма Гарэцкага, што з'явілася нядаўна ў апошнім за гэты год, 12-ым нумары часопіса "Тэрмапілы" (Беласток). Свае нататкі Радзім Гаўрылавіч так і назваў: "Жыццёвы меланж навукоўца". І пачынае іх наступным запісам-тлумачэннем: *"Жыццёвы меланж — так я называю жанр кароткіх замалёвак, мініяцюр, блізкіх да вытрымак з дзённікавых запісаў, якія тычацца розных здарэнняў, праяў, эпізодаў штодзённага жыцця і выкліканых імі пачуццяў, думак. Тэрмін "меланж" (фр. — сумесь) шырока вядомы ў геалогіі. Ён уяўляе сабой своеасаблівае геалагічнае цела, якое складзена з самых разнастайных парод, з іх сумесі, мешаніны, што робіць такое ўтварэнне вельмі стракатым, рознакаляровым, цікавым і загадкавым на выгляд. Такую ж назву носіць і прыгожая тканіна, якая зроблена з сумесі афарбаваных у розныя колеры валокнаў. Геалагічны меланж утвараецца пры розных стрэсавых з'явах, напрыклад, калі адзін вялікі блок, а то і магутны сегмент зямной кары насоўваецца на другі, трэцца аб яго, рухаецца ўздоўж ці ўпоперак яго з агромністай сілай. У выніку ў памежжы гэтых блокаў, у разломныя зоны, якія іх дзеляць, адрываюцца размаітыя па рэчывым складзе, колеры і памерах глыбы і кавалкі горных парод, накопліваюцца тут, і ўтвараецца такім чынам геалагічны меланж".*

Прачыталі навукоўца — геатэктоніка? Зразумелі? Але гэта яшчэ не ўсё. Радзім Гарэцкі не быў бы тут самім сабой, калі б не перайшоў ад меланжа геалагічнага да меланжа сацыяльнага. Ён піша далей:

"Так і ў жыцці людзей уздзеянне чалавека на чалавека, адной супольнасці людзей на другую, краіны на краіну, прыродных феноменаў і іншых самых разнастайных з'яў выклікае стрэсавыя сітуацыі, як станоўчыя, так і адмоўныя, якія і застаюцца ў памяці чалавека. Так узнікае "жыццёвы меланж" — сумесь самых розных з'яў, фізічных і душэўных водгукаў чалавека на рух і развіццё падзей. Яны фіксіруюцца ў памяці, адлюстроўваюцца на палотнах мастакоў, у сродках масавай інфармацыі, творах пісьменнікаў і музыкантаў, афіцыйных дакументах і г.д.".

З цікавасцю чытаеш, — потым перачытваеш, — развагі нашага знанага вучонага, грамадскага дзеяча і публіцыста. Аддаеш належнае той ягонай натурфіласофскай і жыццёвай мудрасці і таму літаратурнаму крэатыву, з якімі ён перакідвае мосцік ад аднаго віду меланжа да другога, і радасна канстатуеш: жыве дух, жывуць, жыццядзейнічаюць гены дзядзькі Радзіма Гаўрылавіча — Максіма і бацькі — Гаўрылы. Згадваеш колішняе прызнанне Гарэцкага-малодшага: разбіраў неяк на дачы бацькавы лісты і дзівіўся падабенству почыркаў, бацькавага і свайго, таму факту, што выпрацаваныя прыродай за стагоддзі гены перадаюць у спадчыну не толькі вонкавае аблічча і пэўныя рысы характараў, але нават і почырк...

Так, яму сапраўды перадаўся генетычна ў спадчыну бацькавы почырк — і ў літаральным, і ў пераносным, духоўным сэнсе гэтага слова.

Радзім Гарэцкі піша пра "ўздзеянне чалавека на чалавека", пра такі псіхалагічны феномен, як "фізічныя і душэўныя водгукі чалавека на рух і развіццё падзей". Хачу сказаць колькі слоў пра ўздзеянне на шмат каго з нас, у тым ліку і на аўтара гэтых радкоў, сапраўднага чалавека, чалавека-патрыёта, чалавека-грамадзяніна Радзіма Гаўрылавіча Гарэцкага. Уздзеянне безумоўна станоўчае, спрыяльнае, плённае. Сустрэчы з ім — як сустрэчы з пагодным, светлым днём. Яны радуюць, абнадзейваюць, настройваюць на даверлівае сумоўе, на суперажыванне, на супрацу. Менавіта ў такім святле згадваюцца і сумесны ўдзел у Міжнародных кангрэсах "Посттаталітарнае грамадства: асоба і нацыя" і "Незалежная прэса: свабода і адказнасць"; і святкаванне 100-х угодкаў з дня нараджэння Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага; і падрыхтоўка сябрамі Рады Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" (яго ўзначальваў, як вядома, на той час Радзім Гарэцкі) унікальнай пасвойму кнігі "Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы"; і абмен думкамі на чарговым пасяджэнні Рады Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны; і прэзентацыя, прысвечаная 115-годдзю з дня нараджэння Максіма Гарэцкага і аўдыёкнігі "Максім Гарэцкі. На імперыялістычнай вайне" (рэжысура і выкананне Алега Вінярскага); і...

І, вядома ж, Гарэцкія чытанні. Падзея з падзей. Сустрэча з сустрэч. Шчаслівая магчымасць сустракаць, чуць, бачыць, бачыць у справе, у дзеянні, у руху Радзіма Гарэцкага (дарэчы, "рух" — адно з улюбёных яго слоў). Чытанні рыхтуюць у асноўным Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх (кіраўнік Р.Гарэцкі, намеснікі М.Мушынскі і Л.Макарэвіч), спецыяльна створаны аргкамітэт з літаратуразнаўцаў і музейных супрацоўнікаў. Але, вядома ж, найперш дае тут пра сябе знаць уздзеянне з боку самога Радзіма Гаўрылавіча, вызначаюцца яго аўтарытэт, яго дзелавыя і чалавечыя якасці, яго схільнасць, кажучы ягонымі ж словамі, не столькі марыць, колькі рабіць жывую справу і рабіць адразу, настойліва, мэтанакіравана, не марачы пра новае жыццё "з чарговага панядзелка". Нездарма ў сваім прывітальным слове да ўдзельнікаў XI па ліку канферэнцыі (18 лютага 2003 года) Янка Брыль зазначаў: *"Душой усіх Гарэцкіх чытанняў быў і застаецца дастойны прадстаўнік слаўнага роду Гарэцкіх — Радзім Гаўрылавіч"*. Як правіла, аддае з удзячнасцю належнае Радзіму Гаўрылавічу пры адкрыцці чарговых чытанняў Лідзія Макарэвіч, дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, у гасцінным памяшканні якога праходзілі апошнія па часе Гарэцкія чытанні. Гаворыць пра яго "невычэрпную энергію і мужнасць", дзякуючы якім выходзяць у свет зборнікі матэрыялаў — дакладаў і выступленняў удзельнікаў Гарэцкіх чытанняў, слушна заначае, што Радзім Гаўрылавіч *"інтэлігентна і мудра працягвае традыцыі сям'і Гарэцкіх, што бачыцца ў кожным яго памкненні і дзеянні..."*

Пацвярджаю самым шчырым чынам гэтыя залатыя і ў час сказаныя словы. Пацвярджаю як сведка, як удзельнік падзей — некалькіх Гарэцкіх чытанняў. Меў гонар выступаць з прывітальным словам, у тым ліку і ў вершаванай форме. Адзін, напісаны з нагоды, верш так і назваў "Чытаю Гарэцкіх..."

Чытаю Гарэцкіх.
Максіма, Гаўрылу, Радзіма...
Вось дзіўнае дзіва!
Чытаю Гарэцкіх.
Гаўрылу, Радзіма, Максіма...
Вось слова! Вось сіла!

Чытаю Гарэцкіх.
Радзіма, Максіма, Гаўрылу...
Божа мой мілы!

Чытаю Гарэцкіх.
Тут лучацца слова і дзея.
Чытаю Гарэцкіх.
Тут нашыя боль і надзея.

Чытаю Гарэцкіх.
Тут нашыя радасць і гора.
Чытаю Гарэцкіх.
Тут нашыя сёння і ўчора.

Чытаю Гарэцкіх.
Максіма, Гаўрылу, Радзіма...
Гучаць трыадзіна!

Насамрэч чытаю, перачытваю. На гэты раз — Радзіма Гарэцкага. Дадатковы стымул — пярэдадзень ягонага 80-годдзя. Праўда, чытаю, гартаю не яго спецыфічна навуковыя працы як сусветна вядомага геолага-тэктоніка (а іх у яго больша за 500!), а вось гэтыя, больш даступныя гуманітарыю-філолагу кнігі: "Шляхам Адраджэння", "Ахвяруючы сваім "я" і "Вечна жыве Беларусь!". Спыняю позірк на пранізліва-шчырых радках: *"У апошняе дзесяцігоддзе я згубіў шмат сваіх блізкіх, сяброў, калег, знаёмых — і старэйшых за мяне, і маладзейшых — і разам з вялікім сумам у сэрцы ад гэтых непапраўных згуб яшчэ больш шаную жыццё, кожную яго хвіліну, адчуваю яшчэ большую радасць жыцця, бо жыць так цікава..."*

Жадаю майму добраму сябру і аднадумцу Радзіму Гарэцкаму заставацца і надалей гэткім жа непапраўным жыццялюбам, гэтак жа молада і нязменна, як і раней, верыць у неабходнасць пераўтварэння сучаснай біясферы ў наасферу, у тое, што гуманныя ідэалы дэмакратыі ідуць усё ж — паводле Вернадскага — ва унісон з геалагічнымі эвалюцыйнымі працэсамі і адпавядаюць гэтай самай наасферы, верыць у беларушчыну і Беларусь, у лепшую, больш шчаслівую долю свайго народа. Будзьма, Радзім Гаўрылавіч!

Анатоль ВЯРЦІНСКІ.



ДАСЬЕ

Гарэцкі Радзім Гаўрылавіч

Нарадзіўся 7 снежня 1928 года ў Мінску.

Вучоны ў галіне геалогіі, геатэктонікі. Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Заслужаны дзеяч навукі.

Закончыў Маскоўскі нафтавы інстытут імя І.М.Губкіна (1952). У 1952—1971 гадах супрацоўнік Геалагічнага інстытута АН СССР. З 1971 г. загадчык аддзела (а з 1978 г. загадчык лабараторыі) Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР (з 1994 г. Інстытут геалагічных навук). У 1977—1993 гадах дырэктар Інстытута геахіміі і геафізікі АН Беларусі. У 1992—1997 гадах віцэ-прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Аўтар звыш 500 навуковых прац, у тым ліку 20 манаграфій.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР 1969 года (у сааўтарстве) за "Тэктанічную карту Еўразіі" і манаграфію "Тэктоніка Еўразіі". Дзяржаўная прэмія БССР у 1978 годзе. Прэмія Расійскай акадэміі навук (1986 г.) імя акадэміка М.С.Шацкага.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Кто ответит за взрыв?

Сотрудникам фирмы "Владпродимпорт", которые уже несколько месяцев находятся в СИЗО, продлили срок содержания под стражей до середины января. Как стало известно "Народной воле", с некоторых из них сняты подозрения в причастности к организации взрыва, который случился в Минске в ночь с 3 на 4 июля. Теперь работников "Владпродимпорта" обвиняют лишь в уклонении от уплаты налогов.

В Министерстве внутренних дел предпочитают не афишировать информацию о том, как ведется расследование дела о взрывах.

"Следственно-оперативная группа по-прежнему работает, — сказали "Народной воле" в МВД. — *Курирует расследование этого дела сам министр. В этом деле не меньшую роль играет и Совет безопасности. Да и другие правоохранительные органы тоже имеют к этому самое непосредственное отношение — каждый отрабатывает свое направление деятельности".*

Министр внутренних дел Наумов пока воздерживается от каких-то комментариев по данному делу.

"Расследование идет своим ходом, однако любой мой ответ даст возможность противоположной стороне предпринять какие-либо действия, поэтому сегодня я воздержусь от комментариев", — не так давно сказал он журналистам.

Напомним, что именно взрыв стал официальной причиной отстранения от должностей главы Администрации президента **Геннадия Невыгласа** и госсекретаря Совета безопасности **Виктора Шеймана**.

"Не думаю, Виктор Владимирович, что вы должны остаться в этой должности после инцидента. Вы виноваты прежде всего, — сказал А.Лукашенко. — *Вы по поручению президента не первый год, а десять лет организовывали подобные мероприятия, вы и глава Администрации (Геннадий Невыглас): его — политическая сторона, а ваша — безопасность".*

В президентском указе написано, что и Шейман, и Невыглас освобождены от должностей *"в связи с переводом на другую работу"*. Невыглас сейчас на общественных началах руководит Федерацией футбола, но зарплату ему там не платят. Чем занимается Шейман — точно не известно. Периодически в народе возникают слухи о том, что *"Шейман застрелился"*, однако эта информация не соответствует действительности.

Марина КОКТЫШ.

ДОСЬЕ "НАРОДНОЙ ВОЛИ"

Самодельное взрывное устройство, спрятанное в пакет от сока "Садочок", сработало в Минске у стелы "Минск — город-герой" во время концерта по случаю Дня независимости Беларуси. В результате взрыва пострадали около 50 человек. Правоохранительные органы возбудили по данному факту уголовное дело по статье "Хулиганство" и "Покушение на убийство".

Представители фирмы "Владпродимпорт", которая занимается импортом продовольствия (в том числе и сока "Садочок"), подозревались в причастности к организации взрыва. Позже им вменили в вину еще и уклонение от уплаты налогов.

ДИКОСТЬ!

Речицкие убийцы пытались вырезать у жертвы сердце

Многие наверняка уже слышали, какие жестокие убийства недавно произошли в Речице. У мужчины, ставшего жертвой преступников, они пытались вырезать сердце, а убитой ими женщине зверски изрезали лицо.

Как сообщает агентство БЕЛТА, изуродованное тело 30-летнего мужчины было найдено в его собственном доме. На уровне сердца в грудной клетке кухонным ножом было прорезано круглое отверстие, ребра выломаны и вставлена пол-литровая стеклянная банка. Следствие рассматривало множество версий. Установлено, что убийца хотел вытащить сердце из трупа, но не сумел.

После жестокого убийства по Речице поползли слухи, что в городе орудует то ли маньяк, то ли банда сатанистов. Но новое преступление, случившееся уже через три дня, расставило все по своим местам. Во дворе своего дома была найдена женщина, избитая и изрезанная до смерти среди бела дня. Эксперты насчитали на теле трупа десятки колото-резаных ран. Преступники попытались убить и бросившегося наутек мужа очередной жертвы. С перерезанным горлом он был найден неподалеку в заброшенном доме. Мужчина выжил и сейчас находится в реанимации. По показаниям единственного свидетеля оперативники задержали двух парней — 17 и 18 лет. Отпечатки их пальцев оказались и на месте первого преступления.

Как выяснилось, преступники знакомились с будущими жертвами, а после распития спиртного жестоко убивали их. По словам представителей следственных органов, причиной первого убийства явилось то, что мужчина злоумышленникам просто не понравился, а сердце они пытались вынуть, чтобы в дальнейшем найти ему применение. Причиной второго преступления называется то, что потерпевшие якобы должны были преступникам деньги.

Сейчас проверяется причастность задержанных к ряду краж и грабежей. Не исключено, что причины нечеловеческой жестокости кроются в том, что в детстве убийцы пережили серьезные психологические травмы. Младшему из-за юного возраста грозит 15-летнее тюремное наказание, старшему — пожизненное заключение или высшая мера — расстрел.

Александр Лукашенко не одинок в борьбе с коррупцией

Ему помогает гомельчанин Михаил Дробышевский

Посмотрев по телевизору, как президент чехвостит в хвост и в гриву тех, кто погряз в коррупции, гомельчанин Михаил Николаевич Дробышевский взялся за перо. В письме на имя А.Г.Лукашенко он уверенно и бескомпромиссно засвидетельствовал: *"...подобные явления имеют место и среди сотрудников органов внутренних дел Гомельской области, правда, чины у них несколько поменьше"*.

И дальше — подробный рассказ о тех, кто незаконно получил элитные участки в известном на всю округу "царском" поселке Победа. *"Данные участки были ими получены незаконно потому, что последние не являлись лицами, которые нуждаются в улучшении жилищных условий, не состояли в очереди лиц, нуждающихся в улучшении жилищных условий, а также без проведения аукциона на землю, то есть абсолютно бесплатно. Таким образом, ими были грубо нарушены требования Вашего Указа №58 от 28 января 2006 года "О некоторых вопросах изъятия и предоставления земельных участков". Мои утверждения не голословны, я имею на руках все необходимые документы, чтобы доказать это, а также фотографии тех дворцов, которые буквально за полтора года возвели себе "слуги народа" на незаконно полученной земле.*

Самое интересное в этой истории то, что когда таким же незаконным способом земля была выделена простой гражданке Жильской В.И., которая также не нуждалась в улучшении жилищных условий, не состояла в очереди лиц, нуждающихся в улучшении жилищных условий, и без аукциона, то прокурор Гомельского района Троханов В.В. проявил необычайную бдительность. Он (Троханов В.В.) напечатал протест на решение Улуковского сельского исполнительного комитета №12-67 от 22.12.2006 года о выделении земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома гражданке Жильской В.И. в поселке Победа Гомельского района. Данный протест прокурора был удовлетворен. Решение о незаконном выделении земли Жильской В.И. было отменено.

Естественно, Троханов В.В. "не заметил" в ходе проверки, что аналогичным незаконным образом земля была выделена и (называются конкретные фамилии чиновников, которые "Народная воля" огласит после окончательной проверки. — **Ред.**) ...".

"Где простые чиновники взяли деньги?" — задается вопросом автор письма президенту гомельчанин Михаил Николаевич Дробышевский.

Теперь на этот и многие другие вопросы ищет ответ Комитет государственного контроля Республики Беларусь.

Степан КУРИЛЬЧИК.



ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО...

Экспарт нафты з Расіі рэзка скараціўся

Экспарт расійскай нафты ў лістападзе 2008 года па адносінах да аналагічнага перыяду мінулага года знізіўся на 17,6 працэнта.

Прычынай гэтага стала высокая экспартная пошліна, якая ва ўмовах глабальнага фінансавага крызісу і падзення коштаў на нафту зрабіла экспарт стратным для нафтавых кампаній.

Здабыча нафты ў лістападзе 2008 года скарацілася на 0,3 працэнта — з 40,3 да 40,2 мільёна тон. З пачатку года гэты паказчык знізіўся на 0,5 працэнта ў параўнанні з мінулым годам. За першыя 11 месяцаў 2008-га здабыча "чорнага золата" склала 447,36 мільёна тон супраць 449,7 мільёна тон годам раней. Тым не менш экспарт на нафтаперапрацоўчыя заводы Беларусі, Украіны і Казахстана ў лістападзе павялічыўся на 6,9 працэнта — да 2,91 мільёна тон. На расійскіх заводах перапрацоўка нафты вырасла на 4,5 працэнта — да 20,65 мільёна тон.

Кошты на нафту з пачатку 2008 года практычна бесперапынна раслі і дасягнулі рэкордная адзнакі ў 147 долараў за барэль да сярэдзіны ліпеня. Пасля гэтага нафта пачала таннець, а яе кошт знізіўся больш як на 60 працэнтаў. З снежня ў сістэме электронных таргоў нью-йоркскай таварнай біржы NYMEX нафта прадавалася крыху даражэй за 47 долараў за барэль.

У лістападзе было адзначана і паніжэнне здабычы, экспарту і перапрацоўкі іншых энергетычных рэсурсаў. Так, экспарт газу "Газпромом" скараціўся на 21 працэнт. Гэта ўжо другі месяц, калі экспартныя паказчыкі газавай манаполіі зніжаюцца — у кастрычніку гэты паказчык упаў на восем працэнтаў. Здабыча газу скарацілася на 2,4 працэнта да 54,4 мільярда кубаметраў з кастрычніка гэтага года і на 6,6 працэнта з лістапада мінулага года.

ЧУЛІ?

Пагранічнікі застануцца без штампаў

З 12 снежня адмяняецца прастаўленне ў пашпартах грамадзян Беларусі дата-штампаў пры перасячэнні беларускай мяжы.

Як паведаміў начальнік прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта **Аляксандр Цішчанка**, у адпаведнасці з палажэннем аб дакументах, што сведчаць асобу, зацверджаным указам, унясенне службовымі асобамі беларускіх органаў пагранічнай службы, якія ажыццяўляюць пагранічны кантроль, адзнакі аб перасячэнні дзяржаўнай мяжы Беларусі -- дата-штампа (адбітка нумаратара-датаўшчыка) -- у пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь не прадугледжана.

Адмена прастаўлення дата-штампаў адбываецца паступова. Нагадаем, ужо летам 2008 года беларускія пагранічнікі не ставілі ў пашпарты грамадзян Беларусі адзнакі аб перасячэнні дзяржаўнай мяжы на ўкраінскім кірунку.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
5 СНЕЖНЯ 2008 г.

ПАМЯЦЬ

Я цяжка ўражаны...

19 лістапада не стала Алега Лойкі. Перасылаю ліст пісьменніка Алеся Цвіка, сябра СБП, а таксама фатаграфію Алега Антонавіча. Мяркую, гэта апошні яго здымак, зроблены мною 10 жніўня гэтага года, тады мы заехалі да яго ў Слонім па дарозе з Зэльвы. Разам са мною былі Алесь Цвік і Міхась Скобла. Нягледзячы на сваю немач, Алег Антонавіч гасцінна і цёпла прыняў нас, расказваў пра блізкае заканчэнне сваёй працы над раманам-эсэ "Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі" (Караткевіч жартам зваў яго Гарсія Лойкам), натхнёна чытаў вершы. Усе мы дзівіліся працаздольнасці, творчай нязломнасці гэтага тытана духу і Беларускага адраджэння, рамантыка, абаяльнага чалавека, заўсёднага любімца студэнтаў.

Вялікі беларус пакінуў горача любімую ім зямлю, Бацькаўшчыну...

Страта, незваротная страта. Але ж сваімі творамі і сваім духам ты, неўбіенны Лорка-Лойка, з намі. Зямля табе пухам!

Васіль Якавенка.

Я вельмі цяжка ўражаны гэтай трагічнай падзеяй. Сустрэўшыся з ім першы раз у жыцці, мы сталі ўмомант добрымі сябрамі, нягледзячы ні на розніцу ва ўзросце, ні на мастацкі вопыт. Гэта быў адкрыты і шчыры, сапраўдны беларус з велізарным запасам дабрыні, цяпла да любога чалавека, але са сваім стойкім поглядам на гісторыю Радзімы і лёс суайчыннікаў.

Я зразумеў, што гэты чалавек быў заўсёды чалавекам сумлення і праўды, якой бы горкай яна ні была. Але ніколі ён не выказваў жорсткасці ці негатыўнай катэгарычнасці да тых, хто вагаўся разам з часам і ягонымі выкрутасамі. Можна было назваць яго і хадзячай энцыклапедыяй, такі быў у яго запас ведаў і глыбіня разважанняў. Але гэтыя вясёлыя, часам сумныя, вочы ніколі не глядзелі з вышыні на таго, хто хацеў прыхіліцца да яго ці спытаць нешта важнае для сябе. Ён ніколі не быў воддалек, не сядзеў у баку, з першых слоў заваёўваў сэрца і душы тых, хто ведаў гэтую знакамітую і гасцінную хату. ХАТУ на Лойкаўшчыне, на вялікай і маленькай Радзіме паэта.

Ведаю, ён цаніў мяне за тое, што я разарваў свае ланцугі і вярнуўся дадому. У пэўным сэнсе — вярнуўся і да Яго на Лойкаўшчыну, бо яна — кавалак Айчыны.

Слава і памяць яму! Доўгага жыцця ўсяму таму, што ён зрабіў для Беларусі і для ўсіх нас! Мы будзем ездзіць да цябе, мы не забудзем Лойкаўшчыну!

Алесь ЦВІК, пісьменнік.

Штутгарт, Германія.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ

Выпускникам готовят места в ПТУ

Моя дочь в этом году заканчивает школу. Не буду даже рассказывать, как проходит этот учебный год и что такое учиться в режиме два года за один, умные люди и сами все понимают. Меня интересует другое: государство в этом году вдвое увеличило число выпускников. Будет ли в связи с этим увеличено число бюджетных мест в вузах?

Чеслава Каравайская, Воложинский район.

— Количество мест для первокурсников в белорусских вузах в будущем году увеличено не будет. Об этот сообщил министр образования Беларуси Александр Радьков. При этом министр отметил, что в средние специальные заведения и ПТУ планируется увеличить набор до 50% в связи с дефицитом рабочих кадров.

СІТУАЦЫЯ

Чаму не рэгіструюць «адкалоўшыхся»?

Праваслаўныя вернікі з гарадскога пасёлка Ружаны звярнуліся за дапамогай да Аляксандра Лукашэнкі.

"Мы, грамадзяне Рэспублікі Беларусь, заснавальнікі праваслаўнай абшчыны ў імя "Веры, Надзеі, Любові і маці іх Сафіі" г.п Ружаны Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці Рускай Праваслаўнай Царквы За мяжой Адэскай епархіі вымушаны да Вас звярнуцца праз сродкі масавай інфармацыі, — пішуць у лісце вернікі. — Пытанне, з якім мы звяртаемся, адно — атрымаць дзяржаўную рэгістрацыю згодна з Канстытуцыяй Беларусі, гарантам якой Вы з'яўляецеся, і Закона "Аб свабодзе сумлення і рэлігіёзных арганізацый". Гэтага мы дабіваемся ўжо на працягу шасці гадоў".

Па словах вернікаў, у лютым 2006 года абшчына другі раз падала дакументы на рэгістрацыю ў Пружанскі райвыканкам. Але атрымалі адказ за подпісам старшыні Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцяў: *"Згодна з Законам, рэлігіёзныя арганізацыі павінны ў абавязковым парадку прайсці рэгістрацыю. Такім чынам сходы вашых аднадумцаў з'яўляюцца супрацьзаконнымі, і таму органамі ўлады да вас былі прыменены законныя меры па недапушчэнні супрацьзаконнай дзейнасці. Адзіным разумным выхадам са склаўшайся сітуацыі з'яўляецца вяртанне ўсіх "адкалоўшыхся" да нармальнага жыцця Праваслаўнага прыхода Свята-Пётра-Паўлаўскай царквы".*

Між тым самі вернікі тлумачаць, чаму яны не хочуць вяртацца да "нармальнага жыцця".

"Нашы рэлігіёзныя раздоры ў Ружанах доўжацца больш за 15 гадоў, — расказваюць яны. — *Свята-Пётра-Паўлаўская царква ў нашым пасёлку з'яўляецца помнікам архітэктуры XV стагоддзя. У царкве было шмат праваслаўных ікон, але яны кудысьці зніклі, была заведзена крымінальная справа. Якую, наколькі вядома, прыгожа закрылі... Наша царква вось ужо шэсць гадоў без рамонту. Пагніўшая, плот павалены, тэрыторыя непрыбраная. Пастаянна збіраюцца грошы на рамонт храма (па некаторай інфармацыі, апошні раз сабралі 3 тысячы долараў), але рамонту да гэтага часу няма. Цікава, ці трымаў фінансавую справаздачу настаяцель Аляксандр Сень? Куды ідуць ахвяраванні прыхаджан? У 2005 годзе ў сувязі з няўвагай да нас епіскапа Іаанна Хомы і тым, што мы бачылі ўсё гэтае беззаконне, мы вырашылі перайсці ў Рускую Праваслаўную Царкву За мяжой Адэскай епархіі і падалі ў Беларусі дакументы на рэгістрацыю. Што тут пачалося! Нам сталі пагражаць, палохаць штрафамі, КДБ. Якая сувязь паміж КДБ і царквой? Аказалася, што ёсць. Просім звярнуць Вашу ўвагу, Аляксандр Рыгоравіч, што мы дабіваемся дзяржаўнай рэгістрацыі па закону. Але напрыканцы кастрычніка гэтага года Пружанскі райвыканкам ізноў вярнуў нам дакументы аб рэгістрацыі. Маўляў, няма юрыдычнага адраса. Але нам добра вядома, што ёсць негалосны загад мясцовых уладаў юрыдычным асобам не прадастаўляць нам юрыдычны адрас. Склалася такая вось непрыемная сітуацыя, у якой і просім Вас разабрацца".*

Усяго пад зваротам падпісалася больш за 30 вернікаў...

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ДИСКУССИЯ

Не все так просто, господин Ткачев...

Приехали родственники из Гродненской области.

— Ну, как хрюшки, как бизнес развивается? — спрашиваю. Нахмурились гости.

— Крест поставили. Дорогие комбикорма, невыгодно свинок выращивать, себе в убыток.

— Так может, молоком займетесь или картошечку станете выращивать? Начальство снова призывает развивать личные подсобные хозяйства, обещает всяческую поддержку.

Мои собеседники рассмеялись:

— Сказка про белого бычка, мы ее уже столько лет слышим, но никто и пальцем не пошевелил, чтобы оказать конкретную помощь. Ты же был в нашей деревне, помнишь, сколько коров было у людей. А сейчас два-три человека держат буренок...

— Что, не по силам?

— Многим, конечно, и не по силам. Люди ж не двужильные. Отработай в колхозе, потом на своем поле до позднего вечера паши. Так хотя бы толк был, знал, за что вкалываешь, а то...

Разговор наш был долгим. И он припомнился мне, когда в руки попала статья "Еще раз к "Сумме вершков и корешков" помощника президента Республики Беларусь Сергея Ткачева, напечатанная в "Советской Белоруссии". Автор, анализируя ситуацию в стране с личными подсобными хозяйствами, приводя большой статистический материал, приходит к выводу: нельзя вести разговор о сокращении того, что всегда было палочкой-выручалочкой, что спасало нас во все времена, что может принести огромную пользу и сегодня.

Не все читали эту статью, поэтому приведу некоторые выдержки из нее.

"Более двух лет назад по поручению Главы государства Правительством была принята Программа развития и поддержки личных подсобных хозяйств граждан на 2006—2010 годы. Однако ни в 2006, ни в 2007 годах не выполнены намеченные в нем самим Правительством задания по производству основных видов сельскохозяйственной продукции — зерна, мяса, молока, яиц, картофеля. Поэтому говорить о том, что вдруг кто-то обеспокоился положением дел в личных подсобных хозяйствах, нельзя...

Положение на местах никто не анализирует. То есть все повторяется...

Если в 2000 году доля домашних хозяйств, не содержащих на личных подворьях вообще видов скота, составляла 33,1 процента, то на начало 2008 года их количество увеличилось до 52 процентов, не содержащих коров — с 57 до 80,5 процента, не содержащих свиней — с 43,9 до 62,9 процента...

Правительство, как свидетельствует анализ этой проблемы, не просто смирилось с тем, что происходит падение производства сельскохозяйственной продукции в личных подсобных хозяйствах населения, но уже даже не обращало на данную проблему внимания. И спокойно прогнозировало дальнейшее падение объемов производства в этом секторе...

Но далее созерцать такое развитие событий было уже недопустимо. Поэтому Глава государства поручил Правительству незамедлительно рассмотреть эту тему. Она и была рассмотрена 30 сентября 2008 года на заседании Президиума Совета Министров... Преждевременное сокращение личных подсобных хозяйств и соответствующие всякого рода теории на этот счет и практически, и политически вредны..."

Вот так, четко и ясно сказано. Поэтому за работу, товарищи сельчане! Родине снова потребовались ваши мозолистые руки, ваши сгорбленные спины. Пролейте пот во имя Отечества!

Чтобы прокомментировать этот призыв и эту статью, я обратился к Алексею Арловскому, известному экономисту, к человеку, хорошо знающему ситуацию на селе.

— Прежде всего я хочу обратить ваше внимание, что поднятая тема явно не выстрадана автором, не пропущена через душу, — сказал ученый. — Все читается между строк и даже в тех строчках, что опубликованы. Обратите внимание: *"продовольственный кризис стремительно покрывает планету. Всемирный банк и МВФ прогнозируют в ближайшие годы реальные голодные бунты в слаборазвитых странах. Сегодня хронически недоедает около 1 миллиарда человек. И их число растет. И на необходимость учета этой политической составляющей проблемы обратил внимание Глава государства. Поэтому Глава государства поручил Правительству незамедлительно рассмотреть эту тему..."*

Вот, оказывается, в чем суть проблемы, а не в том, что помощнику президента Республики Беларусь Сергею Ткачеву захотелось на страницах главной газеты страны подискутировать о развитии личных подсобных хозяйств в Беларуси. Глава государства озабочен мировым продовольственным кризисом и, вероятно, рассчитывает получить какие-то выгоды. Благо, поля наши не заросли еще бурьяном, по лугам пасутся буренки, есть пока крепкие сельскохозяйственные кооперативы. Но ставка почему-то сделана не на них, а на крестьянина, на его огород и приусадебный участок. Хотя догадаться нетрудно: этот крестьянин выручал и во время войны, и во время послевоенной разрухи, и в годы кризисов-разбродов. Должен помочь он и сейчас. Другой причины я не нахожу и беды не вижу. В магазинах полно продуктов, свою продукцию мы везем в Россию, а ее там не хотят брать. Казалось бы, разгреби сегодняшние завалы, продай и освободи склады. Так нет, берись за лопату, сельчанин, копай глубже и решай мировой продовольственный кризис. Вот и вся дискуссия.

Есть, на мой взгляд, и вторая причина. В нашей стране любая дискуссия всегда носила однобокий характер. Публиковалось и озвучивалось только то, что хотели услышать сами авторы идей. Судя по тому, как вопреки здравому смыслу навязывается необходимость привязать крестьян к коровам и свиньям, как просматривается ностальгия по не такому далекому прошлому тех, кто из грязи вышел в князи, догадаться об авторе навязываемой идеи не так уж трудно. Нас снова в XXI веке зовут даже не в XX, а в XIX век.

— Значит, вы не верите помощнику президента? Но есть же Государственная программа возрождения и развития села, в которой не забыты и личные подсобные хозяйства.

— Так, в Государственной программе возрождения и развития села личным подсобным хозяйствам действительно отведена определенная роль. Но все делается на уровне известных лозунгов ЦК КПСС. Призывами проблему не решишь. Помните, перекосы в ценообразовании еще в советские времена делали бессмысленным выращивание свиней на подворье. Вырастить и сдать картофель хотя бы на крахмальный завод уже тогда было гораздо выгоднее, чем кормить им хрюшек. Зачем было тратить деньги на покупку комбикорма, если свинина в магазине стоила копейки? Вот и рушился постепенно тот "уклад", к которому нас призывают вернуться. Не вернемся, в одну речку нельзя войти дважды, а сельчан заставляют в десятый раз окунуться...

— Но помощник президента считает, что заниматься личным подсобным хозяйством на данном этапе просто необходимо. И если не пойти по этому пути, то социальные последствия весьма мрачные: человек на селе без заботы, то есть без своего хозяйства, — это потенциальный пьяница. "Если есть в сарае скотина, то на человека это накладывает обязанности, самодисциплинирует… Дети с детства приобщаются к труду", — вот как трактует ситуацию господин Ткачев.

— Здесь я хочу ему возразить. А может, уважаемый помощник, как раз этим и стимулируется пьянство, воровство на селе? Чтобы держать скотину, выращивать картофель и другие культуры даже на небольших участках, необходимо землю обработать (и не один раз за лето), внести минеральные удобрения, органику, постоянно что-то перевозить, складировать, выполнять немалую работу по кормлению животных, уходу за ними... Самому со всем не управиться, кому-то за что-то нужно заплатить, и не только деньгами, но и бутылкой водки, вина... Именно это способствует тому, что на селе все больше и больше людей пьющих. Молодежь, глядя на родителей, спивается, деградирует. Все более-менее способные мыслить любыми путями убегают из села. Только освобождением людей от тяжелейшей ноши, созданием человеческих условий крестьянам для работы и отдыха можно вернуть молодежь в село. А пока там под видом его развития строятся "курятники" для жилья, возле которых просят поставить коров и свиней. Около Минска и областных центров такие дома еще можно заселить молодежью, для которой жилье благодаря "московским инвестициям" для белорусов недоступно будет еще много лет. А в других регионах оно пустует, селить некого. Так зачем строить?

— Автор предлагает "руководителям сельхозпредприятий не отделять личные подсобные хозяйства от общественного сектора", чтобы руководители отвечали и за него.

— Мысль не нова. Призывы такие давно звучат. Но от них только круги по воде. Конечно, в большом колхозе под названием "Республика Беларусь" можно заставить назначаемых властью маленьких председателей СПК развозить по дворам сено, пахать огороды и даже кормить скотину, принадлежащую доживающим свой век пенсионерам, иначе пожалуются президенту. Но это только ради того, чтобы сохранить лазейку для приписок. Смех вызывают уже некоторые озвученные цифры по производству зерна, картофеля в личных подсобных хозяйствах. Вы только вдумайтесь: 9 миллионов тонн! Оказывается, столько картофеля выращено сельчанами на своих огородах. Но невольно возникает вопрос: а где ж он, этот картофель, если даже крахмал импортный? Такая же дутая цифра и по овощам. Как минимум 70 процентов — прямые приписки. Пройдите по деревням, поспрашивайте у людей, у кого сколько и чего выращено. И вам станет все ясно. Вспомните, ведь когда-то для уборки 7 миллионов тонн картофеля в села высаживался десант студентов, солдат. На станциях стояли эшелоны для отправки "второго хлеба" в Москву, Ленинград, Узбекистан. Днем и ночью шла погрузка. Все площадки около крахмальных заводов были бульбой завалены. А теперь, оказывается, бабки с клюками успешно справляются с этой работой. А ведь технология с тех пор на подворье не изменилась.

— Да, на некоторых приусадебных участках еще и сегодня пашут сохой и не лошадь впрягают, а людей. Я лично видел такую картину, и сам тянул лямку. Сейчас на лопату перешел.

— А что поделаешь, если лошадей в конюшне раз-два и обчелся, когда перед бригадиром надо на колени встать? Но кому-то надо, чтобы кричали о росте валового внутреннего продукта процветающей Беларуси. А когда огороды, личные приусадебные участки включают в общий севооборот, то это не только палочка-выручалочка, но и лазейка для кражи общественного под видом личного. Чем порой и занимаются назначенные вертикальщики и их охранники с генеральскими погонами.

— Предложения автора статьи нам известны. А каковы ваши?

— Что нужно делать — газеты уже писали. Есть прекрасный пример: агрокомбинат "Заря" Мозырского района, где людям все дает предприятие: мясо и молоко, картошку и рыбу, даже медом снабжает. Руководство его не заинтересовано, чтобы работники вкалывали на личных подсобных хозяйствах, пусть на основном производстве стараются и трудятся с полной отдачей. Вот только опыт этого коллектива почему-то умалчивается и не распространяется. Видимо, противоречит проводимой политике, не любят у нас умных руководителей.

— И, следовательно, "преждевременное сокращение личных подсобных хозяйств и соответствующие всякого рода теории на этот счет и практически, и политически вредны"?

— После таких заявлений все дискуссии прекращаются. О чем дискутировать, если это "и практически, и политически вредно"? Давайте будем заниматься уборкой картофеля, кормлением свиней, доением коров, разбрасыванием навоза, голосуя досрочно, чтобы не сбиться с уверенного ритма. Заодно и думать меньше придется: о ситуации в стране, о том, почему уровень заработной платы работников сельского хозяйства по отношению к средней заработной плате по стране снизился с 93,3 процента в 1990 году до 61,9 процента в 2007 году, почему цены растут, а пенсии почти не увеличиваются. Вопросов много, ответов нет. Нет их и в статье помощника президента. Так о чем дискутировать, если лошади чужие, хомут не свой, да еще деньги дерут за постой?

Евгений СОЛОВЬЕВ.

ПРЕДЛАГАЮ!

Нужен новый закон о коррупции

В последнее время очень много говорят о коррупции. Чтобы ее не было в нашем государстве, предлагаю нашему президенту, парламенту принять новый закон о борьбе с коррупцией и предусмотреть в нем такие меры:

1.Всех должностных лиц, состоящих на государственной службе, в правоохранительных и силовых структурах, уличенных в коррупции любого масштаба, в том числе в воровстве госсредств -- лишать воинских званий (до рядового), военных пенсий и подвергать их уголовной ответственности с выплатой (конфискацией) незаконно нажитого имущества.

2.Этим лицам запретить после совершенного преступления занимать в государственных и коммерческих структурах руководящие должности в течение 15 лет, чтобы этот мошенник зарабатывал пенсию не в мягком кресле, а рядом с простым работягой с помощью кувалды, лопаты и лома.

3.Руководителей государственных структур, чьи подчиненные совершили должностные преступления, лишать воинских званий, на одну ступень ниже, зато в нашей пенсионной Беларуси будет меньше генералов, полковников и подполковников, которые сегодня обеспечиваются космическими зарплатами и пенсиями из нашего с вами кармана.

Поверьте, после принятия такого закона коррупция если не полностью исчезнет, то будет серьезно придушена. Укрепится исполнительная дисциплина и ответственность на местах, чиновники не будут думать о шашлыках и водке, каких-то развлечениях, о личном обогащении, а будут думать о том, как не слететь с должности.

Алесь КОЛЕСНИК, житель г.Бреста.

ГОРЬКАЯ ПРАВДА

Как прожить пенсионеру?

Недавно от своего знакомого услышала грустную шутку: "Пенсионеры Европы и Америки путешествуют по миру, а белорусские ходят по миру".

Вот уж действительно...

Елена БУРЯК.

Минск.

РЭЗАНАНС

Хто грае на скрыпцы Маджыні?

З вялікім задавальненнем я прачытаў у нумары за 20 лістапада матэрыял пра выдатнага маладога беларускага скрыпача Арцёма Шышкова і ягоную скрыпку. Вельмі хацелася б, каб такія артыкулы з'яўляліся ў "Народнай волі" як мага часцей, бо "папса" запаланіла ўжо не толькі ўвесь час і плошчу ў медыях, але і розум публікі.

Я — скрыпач, выпускнік Белдзяржкансерваторыі 1963 года, пераможца Рэспубліканскага конкурсу скрыпачоў, некалькі год адпрацаваў на пасадзе мастацкага кіраўніка Гомельскай філармоніі, так што я магу з поўнай адказнасцю заявіць, што нядрэнна арыентуюся ў пытаннях акадэмічнай музыкі. Дык вось, спасылку на скрыпку, якой карыстаўся Антон, выклікала ў мяне вялікую цікавасць, і вось чаму: недзе ў 1972—1973 гадах кафедра струнна-смычковых інструментаў Беларускай кансерваторыі пры падтрымцы, відаць, тагачаснага міністра культуры сп.Міхневіча рабіла захады па стварэнні Беларускай дзяржаўнай калекцыі рарытэтных музычных інструментаў. З гэтай мэтай было вырашана купіць надзвычай каштоўны, ці не другі ў былым СССР інструмент — скрыпку работы аднаго з найвядомейшых італьянскіх майстроў Маджыні, які належаў вядомаму гомельскаму музыку М.Шэндэраву. Дамову аб набыцці інструмента і аплату наяўнымі грашыма ажыццяўлялі прафесар БДК М.Д.Браценнікаў і майстар-рэстаўратар Дзяржкалекцыі СССР сп.Качаргін у маёй прысутнасці.

Некалькі гадоў потым на скрыпцы Маджыні свае сольныя праграмы выконвала Вольга Пархоменка, прафесар Белдзяржкансерваторыі. У прыватнасці, яе выступленне адбылося і ў зале Гомельскага музычнага вучылішча імя Н.Ф.Сакалоўскага (сёння — Гомельскі музычны каледж). На жаль, ад таго часу ніякіх звестак пра гэты выдатны інструмент у мяне няма. Можа, вы палічылі б мэтазгодным пацікавіцца лёсам гэтай рэліквіі і надзвычайнай мастацкай каштоўнасці. Барані Божа, у нашы часы яе мог нехта "прыватызаваць", а гэта трэба было б разглядаць як цяжкае злачынства. Усё роўна, як нехта б скраў "Мадонну" Рафаэля.

Андрэй ЯЎТУХОВІЧ.

в.Навасёлкі Петрыкаўскага раёна.

АНТИРЕКЛАМА

Человек умер, а по БТ его показывают в непристойном виде

Смотрю недавно по телевизору программу "Время". Сообщают о смерти Риммы Казаковой. Понятно, жду добрых слов об этой красивой, удивительной женщине, великолепном поэте, мужественной Матери, которая сумела вырвать сына из цепких "рук" наркомании.

Дождалась — на экране полуголый мужчина спешит в туалет.

Если речь уже зашла об этом рекламном ролике, то кроме возмущения он у меня ничего не вызывает. "Главный герой" — это Андрей Толубеев, бывший актер прославленного БДТ имени Г.Товстоногова. Его отец тоже работал в этом театре. Андрей умер недавно, в 2008 году, а по телевизору все показывают его в непристойном виде, полуголого.

Радует только то, что ни родные, ни близкие, ни благовоспитанные петербуржцы не смотрят БТ. И, пожалуйста, господа телевизионщики, уберите с экрана эту пресловутую коричневую плошку: от нее идет неприятный запах.

Антонина Васильевна СОРОКИНА, жительница Витебска.

Народная Воля http://www.nv-online.info
5 СНЕЖНЯ 2008 г.

ЖУРНАЛІСЦКАЕ РАССЛЕДАВАННЕ

На растрэсканым сподку

Беларускія ўлады прынялі рашэнне будаваць атамную станцыю. А ці ўсё ўлічылі?

Праца над гэтай тэмай пачалася з гнеўнага ліста ў рэдакцыю.

"Навошта вы тыражуеце глупства?! — напісаў нам Васіль Гаўруць. — Беларускія ўлады клапоцяцца пра энергетычную бяспеку краіны і таму вырашылі будаваць АЭС. Але не ўсім хочацца, каб наша дзяржава была сапраўды эканамічна незалежнай, таму паднялі галаву праціўнікі гэтага праекта. Яны даходзяць да таго, што проста выдумляюць розныя страшылкі, а вы іх распаўсюджваеце. Ну якія ў Беларусі могуць быць землятрусы? Яшчэ б іншапланецян успомнілі..."

Гэты абуральны ліст стаў рэакцыяй чытача на публікацыю "Астравецкая атамная — гэта злачынства!", у якой мы расказвалі пра пратэст людзей супраць будаўніцтва АЭС у Астравецкім раёне. Група грамадзян выступіла са зваротам да ўсіх жыхароў Беларусі, органаў улады, еўрапейскай супольнасці, МАГАТЭ і СМІ, у якім заклікала супрацьстаяць будаўніцтву АЭС. Праціўнікі "мірнага атама" лічаць, што *"будаўніцтва АЭС у постчарнобыльскай Беларусі — не проста памылка, а злачынны намер, які можа прывесці да яшчэ большай бяды, чым тая, што ўжо здарылася на нашай зямлі"*.

І заўважаюць: *"АЭС можа быць пабудавана ў самай сейсмічнай зоне нашай краіны, паколькі менавіта ў Астравецкім раёне ў 1909 годзе адбыўся самы моцны на тэрыторыі Беларусі за ўсю гісторыю сейсманазіранняў землятрус, сіла якога складала 7 балаў"*.

Пад зваротам паставілі подпісы шэсць чалавек: географ М.Уласевіч, юрыст І.Крук, гісторык А.Роўда, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, інвалід 2-й групы Я.Александровіч, настаўнік Л.Пукшто, рабочы І.Жалецкі... Але справа нават не ў падпісантах. Нас саміх зацікавіла ўпамінанне пра землятрус, а спадар Гаўруць сваім лістом толькі падштурхнуў да дадатковага вывучэння гэтай тэмы.

Дык ці пагражаюць Беларусі землятрусы?

Беларусь страсянула не раз

Рэшткі найбольш старога з каменных будынкаў, знойдзеных на тэрыторыі нашай краіны, знаходзяцца каля Турава. Тут у спецыяльным павільёне "Скрыпта" і сёння можна пабачыць муры царквы, якая існавала на гэтых землях у XII стагоддзі. Прычым мясцовыя краязнаўцы вам ахвотна распавядуць, што падчас археалагічных раскопак устаноўлена абалютна дакладна: царква была разбурана... землятрусам. Называецца нават дата — 3 мая 1230 года, калі Тураў апынуўся ў зоне моцнага землятрусу з эпіцэнтрам ці то ў Карпатах, ці то на Балканах. І, дарэчы, разбураны быў не нейкі хісткі будынак. Як сцвярджаюць даследчыкі, на тэрыторыі Беларусі гэта быў самы буйны храм (за выключэннем полацкага Сафійскага сабора). Яго памеры складалі больш за 28 метраў у даўжыню і 17 метраў у шырыню, а сама пабудова абапіралася на шэсць унутраных слупоў. І ўсё ж землятрус быў такім, што будынак не ўстаяў.

— Лічыцца, што Беларусь не адносіцца да сейсмічна актыўнай зоны, — расказвае супрацоўнік інстытута геалагічных навук Нацыянальнай Акадэміі навук **Аляксандр ІВАНЧЫКАЎ**. *— І гэта сапраўды так. Але падземныя штуршкі на тэрыторыі нашага рэгіёна здараюцца досыць часта. Яны абумоўлены ў асноўным тэктанічнымі зрухамі з ачаговай зонай у Румыніі. Калі там моц землятрусу дасягае 9 балаў па шкале Рыхтэра, то да Беларусі ўжо даходзяць хвалі 3—5 балаў. Найбольш інтэнсіўныя карпацкія землятрусы, водгалас якіх дакаціўся да нас, рэгістраваліся ў 1940, 1977, 1986 і 1990 гадах. Зусім нядаўна, у 2004 годзе, у Мінску і Гродне быў зафіксаваны землятрус, эпіцэнтр якога знаходзіўся на Балтыцы, калі дакладней — у Калінінградзе. Жыхары шматпавярховак тады, напэўна ўпершыню, убачылі, як кнігі самі сабой спаўзаюць са стала, а шкляны посуд раптам пачынае звінець, хаця тыя, хто працуе і жыве на першых паверхах, нічога незвычайнага ўвогуле не заўважылі.*

Калі гаварыць пра найбольш моцныя землятрусы, якія былі зафіксаваны ў Беларусі, то яны чамусьці адбываліся менавіта ў снежні. Так, 22 снежня 1887 года ў 30 кіламетрах на поўнач ад Барысава зямля страсянулася на 5—6 балаў, 28 снежня 1908 года адбыўся землятрус на мяжы Беларусі і Літвы, калі дакладней — у Ашмянскім і Астравецкім раёнах, дзе зараз плануецца будаваць АЭС. Моц гэтага землятрусу сапраўды складала каля 7 балаў па шкале Рыхтэра. Так што аўтары звароту памыліліся толькі з годам падзеі, а не з самой падзеяй.

Пра тое, што землятрусы ў Беларусі — гэта не запаленне фантазіі і не хваравітая падазронасць некаторых асоб, гаворыць і міністр па надзвычайных сітуацыях **Энвер БАРЫЕЎ**. *"Для Беларусі, таксама як і для іншых краін, землятрусы характэрныя, — прызнае міністр. — Для нас нехарактэрныя разбуральныя землятрусы, а дробных штуршкоў штогод адбываецца дзесяткі"*.

«Уявіце, што вы спрабуеце ісці па разламанай бетоннай пліце»

10 мая 1978 года сейсмічная станцыя "Мінск" зафіксавала першы ўласна беларускі землятрус з эпіцэнтрам у раёне вёскі Кулакі каля Салігорска, падчас якога абваліліся горныя пароды ў шахтах Старобінскага радовішча калійных солей. Як потым падлічылі спецыялісты, з-за землятрусу абрынулася 3000 тон горнай пароды, а яго сіла была каля 5 балаў па шкале Рыхтэра.

Праз пяць гадоў, 1 снежня 1983 года, здарылася аналагічная надзвычайная сітуацыя. На гэты раз эпіцэнтр землятрусу быў у 40 км на поўнач ад Салігорска. Увогуле, слабыя землятрусы фіксуюцца ў Салігорскім раёне штомесяц, ды і не па адным. Спецыялісты сцвярджаюць, што прырода салігорскіх землятрусаў — рукатворная: на "Беларускалі" вымаюцца і перасоўваюцца штогод дзесяткі мільёнаў тон горных парод, сотні мільёнаў тон складзіруюцца ў так званых "адвалах". Як вынік такога ўмяшальніцтва ў зямныя нетры — да сотні невялікіх землятрусаў у год.

Але і без усялякага ўмяшальніцтва чалавека тэктанічная карта нашай краіны, як кажуць, з хітрынкай. Прыблізна 1,7 мільярда гадоў таму на нашай тэрыторыі сутыкнуліся тры буйныя тэктанічныя пліты — Сарматыя, Волгаўралія і Фінасакандыя. Месца іх стыку — гэта цэнтральная Беларусь, і плошча гэтага геалагічна няпростага ўчастка (паміж сабой спецыялісты называюць яго "тры ў адным") мае шырыню прыблізна 200 км. Каб неспецыяліст зразумеў, што гэта азначае, звычайна прыводзіцца такі прыклад: уявіце, што вы спрабуеце ісці па разламанай на некалькі кавалкаў бетоннай пліце; на адным участку адчуваеш устойлівасць, а другі хістаецца, — так адбываецца і на тэктанічным разломе.

Геолагі выдзяляюць у Беларусі некалькі ўчасткаў праяўлення найбольш моцнай сейсмічнасці. Гэта глыбінныя разломы, якія праходзяць па наступных лініях: Коб-рын—Івацэвічы—Вілейка—Верхнядзвінск, Столін—Беразіно—Мсціслаў, Беразіно—Новалукомль—Аболь (Шумілінскі раён), а таксама на поўначы праз Полацк і на поўдні — праз Салігорск. І да любога буйнога будаўніцтва ў такіх зонах (нават калі размова ідзе пра звычайныя шматпавярхоўкі) рэкамендуюць ставіцца асцярожна. Да таго ж тэктанічная карта ўсёй Беларусі вельмі "кучаравая", і геолагі пакуль вывучылі толькі буйныя разломы зямной цвердзі, больш дробныя зоны пакуль з'яўляюцца загадкай. Таму не дзіўна, што пляцоўкі пад будучую беларускую АЭС вывучаюцца так доўга.

У нетрах нешта адбываецца

Гэта толькі здаецца, што мы жывем на раўніннай, знешне спакойнай тэрыторыі, але пад намі, у глыбіні, калі можна так сказаць, ідзе жыццё. Зоны прагібаў, упадзін, разломаў зямной цвердзі — гэта патэнцыйная сейсмічная небяспека, а такіх зон у Беларусі шмат: і Прыпяцкі прагіб, і Аршанская ўпадзіна, і Падлясска-Брэсцкая... Таму невыпадкова Беларусь называюць зонай "ціхіх землятрусаў", якія адбываюцца пастаянна, хаця, дзякуй Богу, не маюць вялікай сілы. І, дарэчы, яшчэ за савецкім часам, у 80-я гады мінулага стагоддзя, па саюзнай праграме менавіта наш Гомель быў абраны навуковай пляцоўкай для вывучэння землятрусаў. Тады каля абласнога цэнтра ў вёсцы Чанкі быў пабудаваны навукова-даследчы комплекс, дзе прабурылі свідравіны спецыяльна для таго, каб сачыць за тым, што адбываецца ў глыбінях. А ўсё таму, што горад стаіць на геалагічных разломах, і недзе на глыбіні 500 метраў пад ім ёсць "жывыя ўчасткі", якія рухаюцца, з-за чаго і ўзнікаюць гойданні і варушэнні паверхні зямлі. І аказваецца, што калі ў беларускіх гарадах мы бачым трэшчыны і расколіны на будынках альбо на асфальце, то не заўсёды трэба наракаць на будаўнікоў ці дарожнікаў. Не так даўно спецыялісты звярнулі ўвагу на тое, што паралельна з хуткімі і моцнымі зрухамі зямлі існуюць і доўгаперыядныя вертыкальныя і гарызантальныя зрушэнні. Гэтая з'ява вельмі небяспечная, бо зямная кара рухаецца павольна, непрыкметна, але ў нейкі момант амплітуда можа стаць крытычнай. Тады і ўзнікаюць на будынках і на дарогах вялікія і малыя расколіны. На жаль, хімічныя і нафтахімічныя прадпрыемствы, газа- і нафтахранілішчы будаваліся ў Беларусі яшчэ тады, калі пра эфект такіх "ціхіх землятрусаў" увогуле не было вядома. Тым часам спецыялісты адзначаюць, што для Беларусі характэрна як апусканне зямной кары (да 2 см у год), так і яе пад'ём (у цэнтральнай частцы фіксуюцца вертыкальныя зрухі да 1 см у год). Іншымі словамі, зямля пад намі на месцы не стаіць.

— У апошнія гады і ў Гомелі, і ў Мінску адзначаецца павелічэнне выдзяленняў з зямных нетраў газаў радон і гелій. Зразумела, гэта не азначае, што нас чакаюць моцныя землятрусы. Але гэта, безумоўна, з'яўляецца яшчэ адным сведчаннем таго, што ў нетрах нешта адбываецца і сейсмічная актыўнасць павялічваецца, — гаворыць **Аляксандр ІВАНЧЫКАЎ**.

Як высвятляецца, сур'ёзна занепакоены тым, што "ў нетрах нешта адбываецца", і ў суседняй Літве. Так, прафесар кафедры геалогіі і мінералогіі Вільнюскага універсітэта Саўлюс Шляўпа заявіў журналістам, што, калі на тэрыторыі Літвы не зафіксаваны ні адзін землятрус, гэта не значыць, што так будзе заўсёды. "Маўчанне" зямных глыбінь, наадварот, выклікае занепакоенасць вучонага. *"Геадэзічныя даследаванні ў Літве пацвярджаюць зрушэнне блокаў горных парод па плоскасці разлому, а зямная кара знаходзіцца пад уплывам напружанасці ў літасферы* (нагадаем, што літасфера — гэта знешняя, цвёрдая абалонка зямлі. — **Рэд.**). *У такіх умовах землятрус з'яўляецца хутчэй правілам, а не выключэннем. За працяглы час у літасферы можа накапіцца напружанасць, якая разрадзіцца асабліва моцным землятрусам"*, — гаворыць вучоны.

У такі прагноз не хочацца верыць, але ён зроблены не бабкай-прарочыцай, а сур'ёзным вучоным, таму ігнараваць падобныя меркаванні проста нельга.

Дарэчы, на пачатку 90-х гадоў прыкладна такія ж аргументы агучвалі і беларускія даследчыкі, якія яшчэ не думалі пра будаўніцтва АЭС, але выступілі з прапановай зрабіць больш жорсткімі патрабаванні да сейсмастойкасці звычайных пабудоў, настойваючы, што ў Беларусі яны павінны праектавацца з разлікам на магчымасць землятрусаў у 7—8 балаў. Праўда, будаўнічае начальства палічыла прапанову немэтазгоднай. У інстытуце "Белпрампраект" нам паведамілі, што сёння сейсмічная бяспека — адно з абавязковых патрабаванняў да ўсіх праектаў, якія прымаюцца ў Беларусі, але беларускія пабудовы павінны вытрымаць землятрус сілай у 6 балаў — менавіта такі "парог устойлівасці" па нашых нормах лічыцца дастатковым. *"У выпадку землятрусу не карыстайцеся ліфтам, і нічога дрэннага не адбудзецца"*, — жартаўліва параілі нам у навуковай установе. Але размаўляць наконт таго, ці небяспечныя *"невялікія землятрусы"* для атамнай станцыі, катэгарычна адмовіліся: *"Не наша пытанне, мы АЭС не займаемся..."*

Ці абмялее Днепр?

Цікава, што абсалютная большасць спецыялістаў упэўнена: дзеля бяспекі пры будаўніцтве АЭС трэба выбіраць пляцоўку так, каб выключыць магчымасць нават невялікага землятрусу. У той жа час большасць АЭС, па крайняй меры на тэрыторыі былога СССР, былі пабудаваны менавіта на тэктанічных разломах. Гэта і Ігналінская АЭС, і Смаленская, і "Сасновы бор" у Ленінградскай вобласці... Тлумачэнне тут простае — для ахалоджвання рэактара патрэбна вада, а рэкі, як правіла, знаходзяць сабе рэчышча па разломах. Не дурні праектавалі савецкія станцыі, аднак сейсмічны фактар пры іх будаўніцтве прынцыпова не ўлічваўся, бо пра актыўнасць геалагічных разломаў навуцы амаль нічога не было вядома тады і мала што вядома сёння. Больш за тое, у тыя часы панаваў тэзіс, што *"на раўнінах землятрусаў не бывае"*. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС, праўда, прымусіла яго перагледзець. Бо, як вядома, па адной з версій, аварыя ў Чарнобылі адбылася менавіта з-за раптоўнага імпульсу з разлому тэктанічнай пліты. Згодна з гэтай версіяй, рэактар падчас землятрусу проста падскочыў і ўжо потым выбухнуў. Версія, праўда, настолькі неверагодная, паверыць у магчымасць землятрусу ў раўніннай зоне так цяжка, што многія ставяцца да яе як да экзатычнай, нягледзячы нават на тое, што поўнага і вычарпальнага *"традыцыйнага тлумачэння"* прычын страшнай аварыі, што адбылася ў 1986-м, знойдзена не было.

Падобна на тое, што да *"ціхіх землятрусаў"* сур'ёзна не ставяцца і пры выбары *"прапіскі"* для беларускага рэактара. Па крайняй меры, адным з галоўных фактараў падбору пляцоўкі, як не раз падкрэслівалі дасведчаныя асобы, з'яўляецца ўсё тая ж блізкасць да вады, а гэта, як мы ўжо ведаем, — найлепшая прыкмета тэктанічнага разлому.

Першапачатковыя адрасы, дзе можа быць размешчана беларуская АЭС, вялікага здзіўлення не выклікалі. Яшчэ на пачатку 90-х гадоў вучоныя нагледзелі для гэтых мэтаў Краснапалянскую пляцоўку (радыеактыўна забруджаны ўчастак у раёне Слаўгарад—Чавусы), а як рэзервовая называлася Кукшынаўская пляцоўка, што на мяжы Шклоўскага і Быхаўскага раёнаў. Ваду для ахалоджвання рэактара, дарэчы, планавалася браць з Дняпра...

Краснапалянская пляцоўка дасканала вывучалася не меней за год, яшчэ год — Кукшынаўская. З сейсмічнага пункту гледжання абедзве, здавалася, вялікай трывогі не выклікалі, але раптам начальнік упраўлення "Праматамнагляду" **Аляксей ШЧАГЛОЎ** паведаміў: *"На пляцоўках, якія папярэдне былі абраны пад будаўніцтва АЭС у Магілёўскай вобласці, выяўлена заляганне мелавых парод, і ёсць сумненні, ці вытрымае грунт вагу рэактара"*. Па яго словах, нагрузка, якую стварае рэактар АЭС, складае да 7 тон на квадратны метр. Катлаван пад рэактар мае памеры 40 на 60 метраў і рыецца на глыбіню 17 метраў. Што будзе, калі пабудаваць АЭС у Магілёўскай вобласці, на думку спецыяліста, можна прасачыць на прыкладзе Хмяльніцкай АЭС, дзе "падобная сітуацыя". *"Мелавыя адклады там знаходзяцца на глыбіні 30 метраў, і ўжо прабурана 11 тысяч свідравін для закачкі бетону, каб узмацніць грунт"*, — дадае Аляксей Шчаглоў.

Такім чынам, на магілёўскіх пляцоўках першы беларускі атамны рэактар мае ўсе шанцы *"ўкапацца ў грунт"*. Гэта *"адкрыццё"*, здавалася, перакрэсліла планы будаўніцтва беларускай АЭС, але даследчыкі складаць рукі не збіраліся і накінуліся на трэцюю з загатаваных пляцовак — у Астравецкім раёне. Пару месяцаў таму кіраўнік Нацыянальнай Акадэміі навук **Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** пераможна паведаміў журналістам, што *"самая лепшая для будаўніцтва АЭС — Астравецкая пляцоўка, паколькі там найбольш выгаднае супраціўленне грунтоў, апорныя здольнасці грунту, пытанні, што звязаны з самой платформай"*. Заява для спецыялістаў стала шокам, бо яшчэ год таму прадстаўнік Аб'яднанага інтытута энергетычных і ядзерных даследаванняў **Ваган КАЗАНЯН** пра гэтую пляцоўку гаварыў так: *"Зямля там растрэсканая, як сподак. А на разломах АЭС будаваць нельга..."* Проста немагчыма паверыць, што нейкім цудам на гэтым *"растрэсканым сподку"* адшукаўся абсалютна бяспечны ўстойлівы кавалачак...

Да таго ж, кіраўнік НАН увогуле не ўспомніў пра тое, што Астравецкая пляцоўка знаходзіцца ў сейсмічна небяспечнай зоне. Ён, напэўна, таксама лічыць, што на раўнінах землятрусаў не бывае.

У любым выпадку да новага года мы ўжо будзем ведаць, дзе вырашана будаваць АЭС. Спецыялісты ўжо зараз настойліва сцвярджаюць, што ні на адной з трох абраных пляцовак фактараў, якія б забаранялі такое будаўніцтва, не ўстаноўлена. Хочацца ім верыць, але...

...Калі гэты матэрыял быў гатовы да друку, мы накіравалі яго эксперту з Інстытута геалагічных навук, які выступаў нашым кансультантам пры падрыхтоўцы артыкула. Ён усё ўважліва прачытаў, ніякіх асаблівых памылак не заўважыў, але праз некалькі гадзін патэлефанаў і папрасіў: *"Здыміце маё прозвішча. Я думаў, што матэрыял будзе пра землятрусы, але ён пра АЭС. А атамная станцыя — гэта палітыка, з-за яе мяне і з работы могуць звольніць"*. І як мы ні ўгаворвалі, чалавек спасылаўся на тое, што ён з-за нашай публікацыі застанецца без працы. Таму сапраўднае прозвішча эксперта мы *"засакрэцілі"*. Але няма сумневу, што недавер да беларускага "атамнага праекта" звязаны ў тым ліку і з тым, што слова пры яго абмеркаванні даецца толькі тым, хто ўсяляк падтрымлівае такое будаўніцтва. Праціўнікі АЭС нават з аўтарытэтных спецыялістаў выступаць са сваімі аргументамі проста баяцца, бо будаўніцтва атамнай станцыі — гэта сапраўды вялікая палітыка. Але не будзем забывацца і пра тое, што закладнікі гэтай палітыкі — мы, наша жыццё і здароўе. І калі з беларускай АЭС нешта здарыцца, то з таго ж Міхаіла Мясніковіча ніхто, па вялікім рахунку, не спытае. Ну, абраў ён пляцоўку на "растрэсканым сподку", ну, не будучы геолагам альбо сейсматэктонікам, памыліўся... І што з яго будзе ўзяць? Ды й каму?..

Алена НОВІКАВА.

АДУСЮЛЬ

Аляксандра Лукашэнку маюць намер запрасіць у Прагу

Калі дзеянне візавых санкцый адносна беларускіх чыноўнікаў у красавіку 2009 года будзе паўторна прыпынена або знята, прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку запросяць узяць удзел у саміце палітыкі Усходняга партнёрства.

Аб гэтым заявіла еўракамісар па знешняй палітыцы Беніта Ферэра-Вальднер. Паводле яе слоў, саміт павінен прайсці ў Празе ў красавіку. Яго арганізацыяй займецца Чэхія, якая ў першым паўгоддзі 2009 года будзе старшынстваваць у ЕС.

На Віцебшчыне 15 чалавек засталіся без даху над галавой

Камунальныя службы Віцебскай вобласці падалі ў суд позвы аб высяленні з кватэр 124 кватэранаймальнікаў. Нагодай стала пратэрмінаваная запазычанасць па квартплаце.

Па рашэнні судоў, 23 даўжнікі перасяліліся ў менш камфортнае жыллё. А вось яшчэ 15 злосных неплацельшчыкаў зусім пазбавіліся даху над галавой.

Акрамя таго, у суды пададзены позвы аб адключэнні ад унутрыдамавых сетак 34 тыс. уладальнікаў кватэр. Больш за 10 тыс. кватэранаймальнікаў ужо не могуць карыстацца вадой і электраэнергіяй з-за непагашаных абавязкаў па квартплаце.

Генпракуратура хоча пасылаць нядбайных бацькоў на знос аварыйных аб'ектаў

Генеральная пракуратура Беларусі патрабуе прыняць дадатковыя меры па прыцягненні да працы нядбайных бацькоў.

Генпракурор Рыгор Васілевіч запатрабаваў нядбайных бацькоў, якія ўхіляюцца ад працы, прыцягваць да фізічных работ, што не патрабуюць адмысловых навыкаў і кваліфікацыі. На думку генпракурора, такія асобы маглі б выконваць працы па зносе аб'ектаў у аварыйным стане, па ліквідацыі несанкцыянаваных звалак бытавых адкідаў і г.д.

Ім свята да лямпачкі

Гарадскія навагоднія ёлкі ў сталіцы паставілі зусім нядаўна, а ўжо ёсць факты крадзяжу лямпачак з гірляндаў.

Так, на ёлцы, пастаўленай каля Нацыянальнай бібліятэкі, ужо выкруцілі 83 лямпачкі. Прыкладна столькі ж не далічыліся іх на ёлцы на праспекце Пераможцаў. Здараецца, што лямпачкі вырываюць разам з патронамі. У выніку гарадскія ёлкі вымушаны былі ўзяць пад ахову супрацоўнікі міліцыі. Хуліганам пагражае адміністрацыйная або крымінальная адказнасць — у залежнасці ад памеру шкоды.

Туман перашкодзіў Кабзону прыляцець у Мінск

Народны артыст СССР Іосіф Кабзон у сераду не прыняў удзел у канцэрце памяці народнага артыста Беларусі Віктара Вуячыча "Я прыйду...", які адбыўся ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. А ўсё таму, што самалёт з Масквы не змог зрабіць пасадку з-за моцнага туману ў аэрапорце беларускай сталіцы.

Іосіф Кабзон прыляцеў у Мінск у 10.40, аднак самалёт не атрымаў пасадкі. Вярнуўшыся ў Маскву, мэтр сцэны прачакаў тры гадзіны ў аэрапорце "Шереметьево" да наступнага рэйса. Аднак той быў увогуле адменены ў сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я.

Народная Воля http://www.nv-online.info
5 СНЕЖНЯ 2008 г.

Кто в команде Обамы?

Период гаданий и предположений о составе новой американской администрации подошел к концу — на 90% будущий кабинет Барака Обамы сформирован, и в оставшиеся до инаугурации дни будут объявляться кандидатуры в основном на второстепенные посты.

Назначения в состав его "военного кабинета", а также в штаб его экономических советников позволяют ответить на вопрос, каким будет стиль правления 44-го президента США — Барака Обамы. Первое, что бросается в глаза, — его подход к кадровой политике основан не на партийных интересах и представлениях о лояльности и личной близости. Куда важнее для него интеллект кандидата и опыт государственного управления.

Назначение на пост главы внешнеполитического ведомства своего недавнего политического соперника и сохранение на посту министра обороны одного из ведущих членов республиканской администрации подтверждают это.

Комментатор газеты New York Times Дэвид Брукс назвал новую администрацию "клубом профессоров". Она действительно в значительной степени состоит из выпускников лучших университетов, входящих в элитную Лигу Плюща. Из 18 постов, объявленных до сих пор, 12 заняты выпускниками Станфордского и Массачусетского технологического университетов, Гарвардской школы бизнеса и Йельского университета.

